Управление по образованию
Минского районного исполнительного комитета

**Государственное учреждение образования**
**«Буцевичский учебно-педагогический комплекс**
**детский сад – средняя школа»**

Конкурс краеведческих работ
«Уроженцы Пристоличья… Помним. Чтим. Гордимся»,
посвященный 75-летию Победы Советского народа
в Великой Отечественной войне

**Номинация «Земляки – славные сыны Отечества»**

Авторы: Уварова Юлия,
Сафроненко Алина
Руководитель: Уварова Наталья
Фёдоровна



Буцевичи, 2020

**Блахін Іван  Міхайлавіч**



Нарадзіўся Іван Міхайлавіч 10 сакавіка ў Сібіры, горад Меляўс.У бацькоў было дзесяцёра дзяцей – 2 дзяўчынкі і 8 хлапчукоў. Бацька працаваў да вайны служачым на пошце, пасля грамадзянскай – старшынёй сельскага савета. Маці займалася выхаваннем дзяцей.

Да вайны Іван Міхайлавіч працаваў трактарыстам, таму ў часы Вялікай Айчыннай быў прызваны ў танкавыя войскі – танкавая навасібірская брыгада.

У 1941 годзе прымаў удзел у абароне Масквы, затым Ленінграда, Сталінграда.Самым цяжкім, па ўспамінах Івана Міхайлавіча, быў 1942 год.

Пад час вайны быў тры разы паранены. Першае раненне атрымаў пад Масквой. Месяц з паловай праляжаў у шпіталі. Другое раненне атрымаў у 1943 годзе пад Курскай дугой. Гарэў у танку. Шэсць месяцаў знаходзіўся ў шпіталі.

Трэцяе раненне атрымаў у 1943 годзе пад Вязьмай. Перад танкістамі стаяў загад ліквідаваць нямецкі дэсант. Пяць месяцаў знаходзіўся ў шпіталі.

Дайшоў да Берліна. Пасля было размеркаванне. Танкістаў расфарміроўвалі ў Сталінград, Кіеў, Мінск. Іван Міхайлавіч выбраў Мінск. У Лагойскім раёне падымаў сельскую гаспадарку. Затым працаваў у вёсцы Камсамолец Мінскага раёна. Тут і пазнаёміўся з будучай жонкай, Лідзіяй Дзянісаўнай Тарасевіч. Лідзія Дзянісаўна разам з маці жыла ў весцы Маславічы, пешшу на працу хадзіла ў Камсамолец. У сям'і з'явілася чацвёра дзяцей – дзве дзяўчынкі і два хлапчукі.

**Драгун Іван Якаўлевіч**



Драгун Іван Якаўлевіч нарадзіўся ў Лагойскім раёне ў вёсцы Янушкавічы. У сям'і, акрамя Івана Якаўлевіча, было яшчэ шасцёра дзяцей – 3 сястры і 3 браты. Бацька – Якаў Станіслававіч – працаваў сталяром, маці займалася выхаваннем дзяцей.

У 1943 годзе Іван Якаўлевіч быў прызваны ў армію. У гэтым жа годзе трапіў у партызанскі атрад "першая антыфашысцкая брыгада". Займаўся падрыўнымі работамі. На дарогах закладваў міны, пад рэльсы – падрыўныя ўстройствы. Атрад жыў у зямлянках. Харчаванне дастаўлялі з суседніх вёсак.

У адной з перастрэлак, падчас абстрэлу самалёта, Іван Якаўлевіч быў

паранены. Разам з атрадам прымаў удзел ў баі пад вёскай Манылы. Цяпер тут знаходзіцца магіла пяцідзесяці загінуўшых партызан.

Пасля вызвалення Беларусі ў складзе пяхотнай часткі ваяваў у Польшчы. Дайшоў да Берліна. Затым быў перакінуты ў Чэхію. У складзе сапёрнай часці шэсць месяцаў праслужыў у Чэхаславакіі. Затым войскі былі перакінуты ў Аўстрыю. Тут часць знаходзілася да 1946 года.

У 1947 годзе быў пераведзены на Украіну (Чарнігаўская вобласць). Пасля дэмабілізацыі прыехаў у веску Жукаўка Мінскага раёна, бо тут жыла яго маці. Працаваў апаратчыкам на смалакурным заводзе да 1961 года.

Затым вучыўся ў Смалявіцкім ПТУ па спецыяльнасці трактарыст-машыніст 3-га разраду. Працаваў у саўгасе "Буцавічы".

Ажаніўся з Марыяй Станіславаўнай. У сям'і нарадзіліся 3 дачкі і сын.

За заслугі перад Айчынай мае ордэн Айчыннай вайны, медаль імя Жукава.



**Васільева Клаўдзія Андрэеўна**

Нарадзілася ў 1919 годзе. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны з 1941 па 1945 г. Ваявала на Заходнім, Варонежскім, Сталінградскім і III Украінскім франтах медыцынскім работнікам. Узнагароджана медалямі "За баявыя заслугі", "За перамогу над Германіяй".

З успамінаў Клаўдзіі Андрэеўны:

Нямецкія танкі прарваліся ў тыл і выйшлі ў раён шпіталя. Урачы, медсёстры былі павешаны, а параненыя спалены. Клаўдзіі Яўгенаўне цудам давялося застацца ў жывых. Праз некаторы час савецкія танкі выбілі ворага. Загінуўшых медработнікаў пахавалі ў брацкай магіле на месце спаленага шпіталя.

Доўгі час жыла ў в. Юзуфова Мінскага раёна, працавала медыцынскім работнікам у Буцавіцкай амбулаторыі. У 1997 годзе пераехала на пастаяннае месцажыхарства ў г. Мінск.

**Праяеў Пётр Пятровіч**



Кожная вёска, горад маюць сваіх герояў, жыхароў, якія справамі, думкамі выхоўваюць цэлыя пакаленні.

Вёсцы Юзуфова пашанцавала з такімі людзьмі.

Тут у 70-80-ых гадах разам з сям'ёй працаваў і жыў Праяеў Пётр Пятровіч.

Пётр Пятровіч настаўнік ад Бога, бо ўсё жыццё прысвяціў выхаванню добрых, шчырых, высакародных людзей.





Мала хто ведае, што помнік загінуўшым у часы Вялікай Айчыннай вайны, які знаходзіцца ў вёсцы Юзуфова, пастаўлены дзякуючы Пятру Пятровічу Праяеву. Да яго прыезду гэта была звычайная магіла з невядомымі салдатамі і партызанамі. Менавіта Пётр Пятровіч арганізаваў пошукавую дзейнасць, у якой прымалі ўдзел і вучні яго класа.

На ўрачыстым адкрыцці помніка прысутнічалі ўсе, адшуканыя Пятром Пятровічам, родныя загінуўшых.

Вучняў настаўнік штогод вадзіў і па месцах партызанскай славы брыгады “Штурмавая”. І кожны год дзеці даведваліся ад Пятра Пятровіча нешта новае.

Пётр Пятровіч устанавіў сувязь з ваенным архівам горада Масквы. Дзеці звязаліся з роднымі загінуўшых. Пасля дасканалай двухгадовай працы на помніку з’явіліся прозвішчы пахаваных салдат і жыхароў.

Адкуль такая ўвага і пашана да салдат і партызан? Звернемся да некаторых біяграфічных звестак.

Бацькі Пятра Пятровіча спачатку жылі ў вёсцы Матвееўка Арэнбургскай вобласці. Потым пераехалі ў Сярэднюю Азію, дзе і аселі ў горадзе Каган. Сям’я была мнагадзетная – сямёра дзяцей. Адразу ж пасля заканчэння школы Пётр Пятровіч быў прызваны ў армію і накіраваны на фронт. Службу пачаў у званні малодшага лейтэнанта, вайну скончыў у званні старэйшага лейтэнанта. Ваяваў на Каўказе, у Крыму, а перамогу сустрэў у Венгрыі.

У пачатку вайны трапіў у акружэнне, дзе атрымаў кантузію, потым некаторы час знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі.

Калі выходзілі з акружэння, ішлі праз Перакоп (перашыек 300 метраў шырынёй і 3 кіламетры даўжынёй) да горада Майкопа па калена ў вадзе. Увесь час знаходзіліся пад абстрэлам. Мала каму давялося выжыць.

За адвагу і гераізм быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і ордэнам Вялікай Айчыннай вайны. Калі і пры якіх абставінах былі атрыманы ўзнагароды, што пры гэтым адчуваў Пётр Пятровіч, ён ніколі не расказваў. Увесь час сцвярджаў: “Война – это страшное дело, о ней вспоминать не стоит”.

І яшчэ медаль за вызваленне Берліна, медаль за вызваленне Каўказа і іншыя баявыя ўзнагароды.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Пётр Пятровіч скончыў Аршанскі настаўніцкі інстытут. На працу быў накіраваны ў Мінскі раён, у веску Гаёк. Тут працаваў дырэктарам і адначасова вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце. З’яўляўся Сталінскім стэпендыятам. У 1973 годзе Пётр Пятровіч быў адзначаны ганаровым знакам “Пераможцы сацыялістычнага



спаборніцтва”, у 1975 годзе – Ганаровай граматай як актывіст фізкультурнага руху за высокія паказчыкі ў рабоце.

**Скібіна Лізавета Антонаўна**



Лізавета Антонаўна Скібіна нарадзілася 20 сакавіка 1926 года на хутары Здарэнне Заслаўскага (цяпер Мінскага раёна). У сям'і было пяцёра дзяцей: Ліза – адна са старэйшых. Калі ў 1938 годзе памёр бацька, то многія сямейныя клопаты ляглі на яе плечы.

Вайна ўварвалася ў жыццё Лізаветы, як і іншых яе аднавяскоўцаў, нечакана. Трагедыя яе пачатковага этапу назаўжды ўрэзалася ў памяць – байцы акружаных і пабітых частак Чырвонай Арміі падаліся ў лясы, каб на акупаванай тэрыторыі стварыць партызанскія атрады. За стварэнне аднаго з іх узяўся маёр Чырвонай Арміі Васіль Варанянскі. Гэтае рашэнне трэба было давесці да акружэнцаў, іх трэба было сабраць і апавясціць. Ва ўмовах найстражэйшай канспірацыі ў доме Лізы арганізавалі так званую штаб-кватэру, дзе па начах збіраліся акружэнцы, каб абмеркаваць усе дэталі стварэння партызанскага атрада. Неўзабаве пад кіраўніцтвам Васіля Варанянскага быў створаны парызанскі атрад "Мсціверц", які граміў ворага на тэрыторыі Мінскай вобласці. Праўда, у 1943 годзе, западозрыўшы мясцовае насельніцтва ў сувязі з партызанамі, фашысты спалілі хутар, дзе жыла Лізавета. Пазбегнуць сустрэчы з карнікамі дапамаглі тутэйшыя лясы, у гушчары якіх некалькі гадоў хавалася мясцовае насельніцтва. Дзякуючы лясной "схованцы", яны і дажылі да перамогі.

У 1945 годзе яна пазнаёмілася са сваім будучым мужам Кузьмой Ільічом, з якім ішлі па жыцці не адно пасляваеннае дзесяцігоддзе, нажылі траіх дзяцей: дваіх сыноў і дачку. Лізавета Антонаўна ў пасляваенныя гады праславілася сваім добрасумленным стаўленнем да працы – працавала даяркай у калгасе "Буцэвічы" амаль паўстагоддзя, нават на пенсіі яна была прыкладам для моладзі. Кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства па вартасці ацэньвала яе працу. Лізавета Антонаўна ўзнагароджана ганаровымі граматамі і падзякамі. На заслужаным адпачынку яна не сядзела склаўшы рукі – узначальвала ветэранскую арганізацыю. Яна добра ведала праблемы і запатрабаванні сваіх пажылых землякоў, старалася ім дапамагчы, а бывала і адстойвала іх інтарэсы.



